Зак. 1, 1844

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ № 16

ШЧЫРАЕ ПРЫВІТАННЕ ДЭПУТАТУ ДРУГУЮ ФІЗКУЛЬТУРНІКАЎ ТАВАРЫШУ СТАЛІНУ

Ба 05/661

УКАЗ
ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Аб зацвярджэнні новага ізабражэння дзяржаўнага герба БССР

У адпаведнасці з унясеннем Першай Сесіяй Вярхоўнага Совета БССР змен у артыкул 119 Канстытуцыі БССР зацвердзіць наступнае ізабражэнне дзяржаўнага герба Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР
Н. Наталевіч.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР
Л. Папкоў.

г. Менск. 29 ліпеня 1938 г.

АПІСАННЕ ГЕРБА БЕЛАРУСКАЙ ССР

Дзяржаўны Герб Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі складаецца з ізабражэння ў праменнях усходзячага сонца сярпа і молата, абкружаных вянком, які складаецца злева з жытніх каласоў, пераплеценых канюшынай, і справа—з жытніх каласоў, пераплеценых ільном; унізе паміж абодвума палавінамі вянка знаходзіцца частка зямнога шара. Абедзве палавіны вянка перавіты чырвонай лентай, на якой змешчаны надпісы на беларускай і рускай мовах: „Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!“, і ніжэй—ініцыялы „БССР“. Уверсе герба знаходзіцца пяціканцовая звязда.

РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ. ВЫДАННЕ ЦК КП(б)Б. № 16. ЖНІВЕНЬ 1938 г.

На вокладцы: Група студэнтак ордэнаноснага Беларускага інстытута фізкультуры на фізкультурным парадзе ў Менску
фота Грунфэста.

Зок.1
1844

ДРУГАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР.

Гэтымі днямі закончыла сваю работу Другая Сесія Вярхоўнага Совета СССР. Сесія разгледзела важнейшыя пытанні, якія маюць аграмаднае палітычнае значэнне для нашай краіны, для ўсяго народа. І да кожнага з гэтых пытанняў выбраннікі народа—дэпутаты Вярхоўнага Совета падыходзілі з большэвіцкай сур'ёзнасцю і дзелавітасцю.

Сесія зацвердзіла закон аб адзіным дзяржаўным бюджэце СССР на 1938 год. У нашым бюджэце, у яго прыходнай і расходнай частках, адлюстроўваецца магутны ўздым краіны перамогшага соцыялізма. Прыходная частка адзінага дзяржаўнага бюджэта на 1938 год складаецца з 132,6 мільярда рублёў; расходная—з 131,1 мільярда рублёў. Прыходная частка бюджэта перавышае расходную на паўтара мільярда рублёў.

Якая аграмадная розніца паміж бюджэтам любой капіталістычнай краіны і нашым! У краінах капітала даходы ў бюджэце складаюцца з абрабавання насельніцтва невыноснымі падаткамі. Рабочыя і сяляне капіталістычных краін асабліва востра адчуваюць гэты грабёж. Падаткі пазбаўляюць апошняга кавалка хлеба працоўныя масы.

Расходы ў капіталістычных краінах, асабліва ў фашысцкіх, ідуць у аграмаднай колькасці на падрыхтоўку і вядзенне вайны. Гэта-ж факт, што ў Японіі 79 проц. з бюджэта расходуецца на ваенныя патрэбы.

У нас асноўная і галоўная крыніца даходаў у бюджэце складаецца з соцыялістычнай гаспадаркі. У нас няўхільна растуць дзяржаўныя прадпрыемствы, якія прыносяць прыбытак, расце тавараварот, павышаецца вытворчасць працы.

Сталінскімі клопатамі аб чалавеку пранікнута ўся расходная частка бюджэта. Велізарныя сумы расходуюцца ў нас на соцыяльна-культурныя мерапрыемствы. Дастаткова сказаць, што за апошнія дзесяць год расходы на соцыяльна-культурныя мерапрыемствы насельніцтва павялічыліся ў дваццаць разоў.

Ні адна краіна ў свеце не расходуе столькі сродкаў на асвету, колькі наша. Толькі ў вышэйшых навучальных установах у СССР абучаецца значна больш студэнтаў, чым у Германіі, Італіі, Англіі, Францыі і Японіі разам узятых. Нашы студэнты забяспечваюцца стыпендыяй, сума якой з года ў год павышаецца.

У бюджэце СССР на 1938 год асабліва адлюстраваны велізарнейшыя клопаты партыі і ўрада аб жанчынах і дзецях. У дзіцячых садах у гэтым годзе павінна быць на 256 тысяч дзяцей больш, чым у мінулым годзе. Колькасць коек у яслях павялічваецца на 161 тысячу. 1 мільярд 382 мільна рублёў мяркуецца выдаткаваць на мерапрыемствы па ахове мацярынства і младзенства. 900 мільёнаў рублёў прадугледжана выплаціць многадзетным мацерам. Аналізуючы гэтыя лічбы кожная жанчына асабліва наглядна можа ўпэўніцца, што такія клопаты аб мацерах і іх дзецях магчымы толькі ў вялікім Совецкім Саюзе.

З асаблівым задавальненнем совецкі народ сустрэў паведамленне аб тым, што 27 мільярдаў рублёў адпушчаны на выдаткі на абарону краіны. Наша армія самая міралюбівая ў свеце. Яна, як і ўвесь народ, не хоча вайны, але заўсёды да вайны гатова. Пры першым пасягацельстве на свяшчэнныя граніцы СССР магутная Чырвоная Армія гатова сцерці ў парашок любога ворага. Гэта асабліва ярка пацвердзілі апошнія падзеі на Далёкім Усходзе. Увесь свет яшчэ раз упэўніўся як моцна наша Чырвоная Армія, правучыўшая абнаглеўшых японскіх самураяў.

Прыняты Сесіяй „Закон аб судаўстройстве СССР, саюзных і аўтаномных рэспублік" мае велізарнае значэнне. Гэты закон падымае совецкі суд на яшчэ большую вышыню і павялічвае яшчэ больш яго аўтарытэт сярод насельніцтва. Гэты закон накіраван на далейшую ўзмоцненую барацьбу супроць здраднікаў радзімы—фашысцкіх наймітаў трацкісцка-бухарынскай нечысці, супроць шпіёнаў, шкоднікаў і дыверсантаў.

Вялікую актыўнасць дэпутатаў выклікала абгаварэнне „Закона аб грамадзянстве СССР". Быць грамадзянінам СССР—гэта вялікае шчасце, вялікі гонар! І зараз, вывучаючы гэты выдатны закон, з асаблівай сілай успамінаюцца словы любімага пролетарскага паэта В. Маякоўскага:

Читайте,
завидуйте,
я—
гражданин
Советского Союза.

Сесія зацвердзіла таксама і іншыя важнейшыя законы: „Аб парадку ратыфікацыі і дэнансацыі міжнародных дагавораў СССР", „Закон аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак", „Закон аб усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы". З велізарным уздымам Сесія зацвердзіла ўказ прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб новых прызначэннях лепшых саратнікаў вялікага Сталіна—Лазара Майсеевіча Кагановіча і Нікалая Іванавіча Ежова. Л. М. Каганович зацверджан Народным Камісарам шляхоў зносін па сумяшчэнню з работай Народнага Камісара цяжкай прамысловасці. Тав. Каганович таксама зацверджан Намеснікам Старшыні Совета Народных Камісараў СССР. Нікалай Іванавіч Ежоў зацверджан Народным Камісарам воднага транспарта па сумяшчэнню з работай Народнага Камісара Унутраных Спраў.

12 дзён праходзіла Сесія Вярхоўнага Совета. Яна яшчэ раз прадэманстравала перад усім светам магутнасць соцыялістычнага парламента. Дэпутаты яшчэ раз даказалі, што яны з'яўляюцца дзеячамі ленінска-сталінскага тыпу. Клопаты аб радзіме і яе росквіту адчуваліся ў кожнай прамове дэпутатаў.

Дэпутаты прыступілі да справаздач аб рабоце Другой Сесіі. Яны расказваюць аб прынятых законах, аб незабыўных днях прабывання ў Крэмлі, аб сустрэчах з родным вялікім Сталіным. Выбаршчыкі горача адабраюць прынятыя Сесіяй рашэнні таму, што гэтыя рашэнні павялічваюць магутнасць і непарушальнасць вялікага Совецкага Саюза.

Прамова дэпутата Н. Я. Наталевіча

У спрэчках па дакладу АБ АДЗІНЫМ ДЗЯРЖАЎНЫМ БЮДЖЭЦЕ СССР НА 1938 г.

На пасяджэнні Совета Саюза 13 жніўня 1938 года

Таварышы дэпутаты, на зацвярджэнне 2-й Сесіі Вярхоўнага Совета СССР Советам Народных Камісараў Саюза ССР унесен адзіны дзяржаўны бюджэт Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік на 1938 г.

Бюджэт нашай соцыялістычнай дзяржавы ў 1938 годзе па даходах дасягае каласальнай сумы—125.184,2 млн. руб. Па расходах—123.684,2 млн. руб. Даход перавышае расход на 1.500 млн. руб. Такога магутнага бюджэта не мае ні адна капіталістычная краіна.

СССР, краіна перамогшага соцыялізма, мае самы вялікі, самы магутны і самы ўстойлівы адзіны дзяржаўны бюджэт.

Запраектаваная сума адзінага дзяржаўнага бюджэта на 1938 год сведчыць аб устойлівасці совецкага рубля, аб фінансавай і гаспадарчай магутнасці нашай соцыялістычнай радзімы, аб несакрушальнай сіле і магутнасці нашай соцыялістычнай дзяржавы. У ажыццяўленні нашага дзяржаўнага бюджэта моцна ўпэўнены ўсе працоўныя вялікага Совецкага Саюза.

У нас ёсць усе магчымасці для яго выкананння.

Матэрыяльныя рэсурсы нашай краіны каласальныя. Сілы і магчымасці вялікага совецкага народа бязмежны. Працоўныя нашай вялікай радзімы ясна ўяўляюць, што цвёрдае і няўхільнае выкананне дзяржаўнага бюджэта забяспечвае ажыццяўленне планаў вялікай соцыялістычнай будоўлі. Рэалізацыя ўнесенага на зацвярджэнне 2-й Сесіі Вярхоўнага Совета СССР дзяржаўнага бюджэта на 1938 год яшчэ ў большай меры палепшыць і павысіць добрабыт працоўных, дасць магчымасць яшчэ ў большай ступені аснасціць навейшай баявой тэхнікай нашу слаўную, любімую і непераможную Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію—вернага вартавога нашых совецкіх рубяжоў, дасць магчымасць на страх ворагам і на радасць прыяцелям яшчэ вышэй падняць боездольнасць нашай вялікай соцыялістычнай радзімы.

Працоўныя нашай краіны добра ведаюць, што кожны рубель і кожная капейка з совецкага дзяржаўнага бюджэта ідзе на справу соцыялістычнага будаўніцтва, на карысць вялікага совецкага народа. Вось чаму кожны грамадзянін Совецкага Саюза, як горды патрыёт сваёй радзімы, лічыць сваім доўгам і гонарам прыкласці ўсе намаганні к таму, каб садзейнічаць выкананню дзяржаўнага бюджэта на 1938 год.

Паспяховае ажыццяўленне совецкага дзяржаўнага бюджэта забяспечвае сістэма нашай соцыялістычнай дзяржавы, у перавагах якой даўно пераканаліся не толькі нашы прыяцелі, але і нашы ворагі. Некаторыя з гэтых ворагаў пераканаліся ў перавагах соцыялістычнай сістэмы на сваіх спінах.

Паспяховае ажыццяўленне дзяржаўнага бюджэта забяспечваецца мудрым кіраўніцтвам нашай слаўнай непераможнай партыі Леніна—Сталіна і асабіста вялікага і мудрага таварыша Сталіна. **(Бурныя апладысменты).**

У нашай партыі і совецкага ўрада няма іншых інтарэсаў, акрамя інтарэсаў совецкага народа. Таму адзіны дзяржаўны бюджэт на 1938 год, які ўносіцца нашым совецкім урадам на зацвярджэнне Другой Сесіі Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, выражае волю і спадзяванні ўсяго совецкага народа.

Паны капіталісты лічаць неабходным не стадзіць пытання аб дзяржаўным бюджэце на абмеркаванне буржуазных парламентаў. Яны імкнуцца ўтоіць ад працоўных эксплаататарскі і паразітычны характар капіталістычнага бюджэта, гэтым самым прабуючы ўтоіць паразітычны характар самога капіталізма. Совецкаму ўраду няма чаго скрываць ад народа крыніцы даходнай часткі бюджэта і артыкулы яго расходнай часткі. Наадварот, совецкі ўрад выносіць на абмеркаванне і зацвярджэнне Вярхоўнага Совета СССР дзяржаўны бюджэт, каб увесь совецкі народ праз сваіх выбраннікаў—дэпутатаў Вярхоўнага Совета—абмеркаваў і зацвердзіў кожны артыкул даходаў і расходаў, каб кожны совецкі рубель эканомна і рацыянальна быў скарыстан у інтарэсах соцыялістычнага будаўніцтва, росквіту нашай радзімы і ўмацавання яе абароназдольнасці.

Увесь многамільённы совецкі народ, як адзін чалавек, будзе змагацца за выкананне мерапрыемстваў, забяспечваючых выкананне нашага дзяржаўнага бюджэта. У гэтым перавага і сіла совецкага дэмакратызма, у гэтым перавага і моцнасць нашага дзяржаўнага бюджэта.

Запраектаваная даходная частка адзінага дзяржаўнага бюджэта Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік на 1938 год у суме 125.184,2 млн. руб. адлюстроўвае, як у люстры, усю веліч перамог рабочага класа і калгаснага сялянства, дасягнутых пад кіраўніцтвам слаўнай, непераможнай партыі Леніна--Сталіна і нашага мудрага правадыра і настаўніка—вялікага Сталіна. (**Бурныя апладысменты**).

Мы стварылі сваю цяжкую індустрыю, што дало нам магчымасць падвесці тэхнічную базу пад усе галіны народнай гаспадаркі, забяспечыць эканамічную незалежнасць ад капіталістычных краін, умацаваць абароназдольнасць совецкай краіны, зрабіць нашу радзіму непрыступнай крэпасцю, аб якую абламае зубы любы фашысцкі сабака, калі ўздумае парушыць недатыкальнасць нашых совецкіх граніц.

Мы сталі краінай соцыялістычнага земляробства. Нашы калгаснікі жывуць заможным, культурным, шчаслівым жыццём. Небывалага росквіту ў галіне культуры і мастацтва дасягнулі народы нашага многанацыянальнага Совецкага Саюза.

Наш СССР--краіна перадавой індустрыі, перадавой сельскай гаспадаркі, перадавой навукі і тэхнікі, краіна светлага, радаснага, культурнага, заможнага жыцця мільённых мас. Усімі гэтымі дасягненнямі і перамогамі совецкі народ абавязан партыі Леніна—Сталіна і мудраму правадыру, другу і настаўніку вялікаму Сталіну. (**Бурныя апладысменты**).

Штодзённыя клопаты нашай партыі і совецкага ўрада аб эканамічным і культурным развіцці нацыянальных рэспублік і абласцей знаходзяць сваё яркае адлюстраванне ў бюджэце Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі на 1938 год.

Бюджэт БССР на 1938 год складае 1.167.210 тыс. руб. Беларусь да Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі не мела сваёй дзяржаўнасці. Значыцца, у той час не магло быць і гутаркі аб дзяржаўным бюджэце ў Беларусі. Багацці Беларусі—лясы, землі—належалі памешчыкам, князям і папам. Беларускі селянін вякамі гнуў спіну на польскіх і рускіх памешчыкаў, кулакоў і папоў, жыў у галечы, холадзе і голадзе. Зямля апрацоўвалася сахой і драўлянай бараной, хлеб яклі напалову з мякінай і карой, і то хапала толькі да каляд.

Беларускі народ у пісьме вялікаму Сталіну ўспамінае сваё кашмарнае мінулае словамі:

„А было нядаўна, а было калісьці,
Калі мы з зямелькі не мелі карысці...
На абед была нам лебяда з мякінай,
А далей магіла пад сухой асінай".

Галеча і голад гналі беларускага селяніна на перасяленне. У адну Амерыку за 12 дарэволюцыйных год пераехала 80 тыс. чалавек, у Сібір перасялілася 642 тыс. чалавек.

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя навекі пахавала памешчыкаў, капіталістаў і ўсіх эксплаататараў. Вялікая Кастрычніцкая рэволюцыя дала магчымасць разгарнуцца найвялікшым творчым сілам і здольнасцям беларускага народа. Не гледзячы на проіскі подлых ворагаў народа, прадажнай трацкісцка-бухарынскай і буржуазна-нацыяналістычнай зграі нямецкіх і польскіх шпіёнаў і дыверсантаў, Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна і пры велізарнай дапамозе вялікага гераічнага рускага народа дабілася ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва выдатных поспехаў.

Беларусь стала індустрыяльна-аграрнай рэспублікай з буйнай прамысловасцю і соцыялістычнай сельскай гаспадаркай. Там, дзе раней па полю цягнуў саху і драўляную барану захудалы і слабасільны конь, зараз працуе трактар і камбайн.

Беларусь стала квітнеючай ордэнаноснай рэспублікай. Совецкі Саюз забяспечыў для БССР няўхільны рост дзяржаўнага бюджэта і адпаведна высокія тэмпы развіцця соцыялістычнай прамысловасці.

Валавая прадукцыя ўсёй прамысловасці на тэрыторыі цяперашняй Беларусі ў 1913 годзе ў цэнах 1927 года складала 89 млн. руб. Аб'ём валавой прадукцыі ў 1937 г.—2.100 млн. руб.

За годы двух сталінскіх пяцігодак Беларусь карэнным чынам змяніла свой твар. Цяпер у нас ёсць прамысловасць металаапрацоўчая, тарфяная, лясных будматэрыялаў, хімічная, паліграфічная, сельскагаспадарчага машынабудаўніцтва, станкабудаўніцтва, лёгкая і харчовая.

Запраектаваныя па бюджэту 1938 года расходы на развіццё прамысловасці БССР у суме 66 млн. руб. даюць магчымасць дасягнуць новых поспехаў і яшчэ больш умацаваць нашу пагранічную рэспубліку.

Некалькі слоў аб сельскай гаспадарцы. Ворагі народа, здраднікі нашай радзімы, польскія найміты шмат нашкодзілі ў сельскай гаспадарцы. Наша партыя, урад і органы НКВД на чале з слаўным сталінскім наркомам тав. Н. І. Ежовым, наш вялікі Сталін дапамаглі беларускаму народу выкрыць і знішчыць заклятых ворагаў народа і аказалі нам вялікую дапамогу ў перабудове сельскай гаспадаркі.

Да Вялікай соцыялістычнай рэволюцыі ў Беларусі было 838.400 аднаасобных сялянскіх гаспадарак, 214.587 сох і 420.942 драўляныя бараны.

Цяпер у нас 9.964 калгасы, якія засяваюць 96,4 проц. усёй пасеўнай плошчы, 215 МТС з наяўнасцю 8.140 трактароў, 1.000 камбайнаў, 3.800 малацілак, 1.200 ільноцерабілак, 3.416 аўтамашын. Уся гэта тэхніка дапамагае беларускаму народу ў барацьбе за высокі ўраджай, за заможнае, шчаслівае калгаснае жыццё.

36.465 тыс. руб., запраектаваныя па бюджэту 1938 года на развіццё сельскай гаспадаркі Беларусі, забяспечваюць яшчэ большыя магчымасці для тэхнічнага аснашчэння земляробства, для яшчэ большага гаспадарчага і арганізацыйнага ўмацавання калгасаў і большэвіцкай барацьбы нашых калгаснікаў за высокі сталінскі ўраджай, за заможнае і культурнае жыццё.

На соцыяльна-культурныя патрэбы намечана адпусціць для Беларускай ССР у 1938 годзе 830 млн. руб. супроць 685 млн. руб. у 1937 годзе,

што дае рост, у параўнанні з мінулым годам, на 21,2 проц.

Да рэволюцыі 75 проц. насельніцтва Беларусі было непісьменным. Жанчын было непісьменных 90 проц. Затое ў Беларусі было 3 тыс. цэркваў, 704 сінагогі, 113 касцёлаў, 5 тысяч манаполек, 6 тысяч папоў, равінаў і ксяндзоў.

Царскі ўрад у 1914 годзе на народную асвету расходаваў каля 60 кап. на чалавека. Зараз у Беларусі расходуецца больш 100 рублёў на чалавека.

Беларусь зараз з'яўляецца рэспублікай суцэльнай пісьменнасці. У БССР ёсць 7.069 школ, у іх навучаецца 1.068.000 дзяцей працоўных; у 98 тэхнікумах вучыцца 32.975 студэнтаў; у 23 ВНУ—14.626 студэнтаў. У школах працуюць 32.050 настаўнікаў. Кожны год з ВНУ і тэхнікумаў выпускаюцца тысячы маладых совецкіх спецыялістаў, актыўных будаўнікоў соцыялізма.

Толькі ва ўмовах краіны перамогшага соцыялізма магчым такі росквіт культуры, навукі і мастацтва.

Нястомныя клопаты партыі, совецкага ўрада і асабіста таварыша Сталіна аб паляпшэнні матэрыяльна-бытавых умоў працоўных знаходзяць сваё яркае адлюстраванне ў расходнай частцы бюджэта на 1938 год.

У 1914 годзе на ахову здароўя па Беларусі царскі ўрад зрасходаваў 800 тыс. рублёў. У 1938 годзе па бюджэту БССР (не ўключаючы мясцовы бюджэт) намечана зрасходаваць на ахову здароўя 69.964 тыс. руб. і на справу соцыяльнага забеспячэння—32.322 тыс. руб.

З моманту выдання закона аб дапамозе многадзетным выдана дзяржаўнай дапамогі 55.212 тыс. рублёў.

Так з года ў год расце матэрыяльна-культурны добрабыт працоўных мас Беларусі. Я цалкам і поўнасцю падтрымліваю прапанову выступаўшых дэпутатаў аб зацвярджэнні адзінага дзяржаўнага бюджэта СССР на 1938 год, у тым выглядзе, у якім ён прадстаўлен на разгляд Другой Сесіі Вярхоўнага Совета СССР, з улікам заўваг, што ўнеслі дэпутаты.

У сваім дакладзе народны камісар фінансаў СССР тав. Зверэў справядліва і правільна крытыкаваў слабую дзейнасць фінансавых органаў БССР. Яго заўвага аб тым, што БССР адстае ў частцы паступлення даходаў па падатках і зборах з насельніцтва, правільна. Тут не толькі віна фінансавых работнікаў, але і вялікая віна работнікаў сельсоветаў, райвыканкомаў і работнікаў абласнога і рэспубліканскага апарата. Віна іх заключаецца ў тым, што яны не вядуць сапраўднай большэвіцкай работы з аднаасобнікамі, не здолелі дабіцца выканання імі ў тэрмін дзяржаўных абавязацельстваў. Па сутнасці гэтыя работнікі самі сталі на шлях процізаконнай практыкі, не спагнаўшы да гэтага часу з аднаасобнікаў лічачуюся запазычанасць па сельгаспадатку ў суме 3.162 тыс. рублёў і па культзборах у суме 8.418 тыс. руб. Работнікі БССР несумненна ўлічаць у сваёй практычнай рабоце крытычныя заўвагі тав. Зверэва, і адставанне будзе ліквідавана ў самы бліжэйшы час.

Я лічу неабходным звярнуць увагу работнікаў Наркамфіна і асабіста тав. Зверэва на нездавальняючую работу апарата Наркамфіна па складанню матэрыялаў да бюджэта. У прыватнасці, да гэтага часу не ўнесена яснасць у пытанне аб ліквідацыі прарыву ў абаротных сродках Наркоммясцпрома БССР у суме 6 млн. руб. Пры звёрстванні фінансавага плана Наркомлеса Наркамфін БССР выключыў 4.692 тыс. руб., прылічваючыся да звароту трэсту Лесбел па адлічэннях ад прыбыткаў за 1937 год. Гэту памылку Наркамфін прызнаў, але да гэтага часу не выправіў.

Асталіся неўдакладненымі таксама адлічэнні падатку з абароту і лічбы па ўпраўленчых расходах у сувязі з арганізацыяй у рэспубліцы абласцей. Спадзяюся, што апарат Наркамфіна СССР і тав. Зверэў унясуць яснасць у бліжэйшыя дні па ўсіх гэтых пытаннях.

Другая Сесія Вярхоўнага Совета СССР праходзіць ва ўмовах выключна абвостранай міжнароднай абстаноўкі. Неспыняючыяся правакацыі з боку фашысцкіх агрэсараў і, у прыватнасці, правакацыі японскай ваеншчыны на нашых Далёка-Усходніх граніцах сведчаць аб імкненні фашысцкіх дзяржаў уцягнуць нас у вайну. Праўда, усе гэтыя спробы разбіваюцца ўшчэнт аб несакрушальную сілу і магутнасць нашай слаўнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Але гэта ні ў якім выпадку не павінна нас супакойваць. Мы павінны яшчэ больш умацоўваць абароназдольнасць Совецкага Саюза, яшчэ больш павышаць баявую магутнасць Чырвонай Арміі. Вось чаму расходы на абарону нашай краіны ў намечанай па праекту бюджэта суме 27 мільярдаў рублёў—дэпутаты беларускага народа сустракаюць з выключным адабрэннем.

Галасуючы за зацвярджэнне адзінага дзяржаўнага бюджэта на 1938 год у цэлым, галасуючы за бюджэтныя асігнаванні ў 27 мільярдаў рублёў на абарону краіны, я думаю—не памылюся, калі скажу, што мы цалкам і поўнасцю выражаем гэтым самым волю нашых выбаршчыкаў, волю нашага вялікага совецкага народа. Наш народ гатоў у любую мінуту па закліку нашай партыі і Совецкага ўрада, па закліку нашага вялікага Сталіна выступіць на абарону сваёй любімай радзімы-маці і разам з нашай слаўнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміяй знішчыць усякага ворага, які ўздумае пасягнуць на нашу незалежнасць, на нашу свяшчэнную зямлю, на нашу свабоду.

Няхай мацнее несакрушальная сіла і баявая магутнасць нашай непераможнай слаўнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі!

Няхай жыве наша Чырвоная Армія—верны вартавы совецкіх граніц!

Няхай жыве яе слаўны палкаводзец—Першы маршал Совецкага Саюза таварыш Варашылаў!

(Усе ўстаюць і наладжваюць бурную авацыю ў гонар таварыша Варашылава. Воклічы: „Няхай жыве Першы маршал Совецкага Саюза, жалезны нарком таварыш Варашылаў!").

Няхай мацнее абароназдольнасць і магутнасць нашай соцыялістычнай радзімы на страх ворагам і на радасць нашым прыяцелям!

Няхай жыве наша цудоўная совецкая радзіма!

Няхай жыве вялікі геній чалавецтва, наш правадыр і настаўнік — мудры і вялікі Сталін!

(Усе ўстаюць і наладжваюць бурную, доўга незмаўкаючую авацыю ў гонар таварыша Сталіна).

Прамова дэпутата ЕЎМЕНАВАЙ С.

У спрэчках па дакладу аб праекце закона „АБ ДЗЯРЖАЎНЫМ ПАДАТКУ НА КОНЕЙ АДНААСОБНЫХ ГАСПАДАРАК“

Таварышы дэпутаты! Праслухаўшы даклад дэпутата Угарава і азнаёміўшыся з праектам закона „Аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак“, хачу зрабіць некалькі заўваг

Я працую старшынёй праўлення калгаса і кожны дзень назіраю як працуюць аднаасобнікі, як яны выкарыстоўваюць сваіх коней. Мне таксама вядомы іх даходы і заработкі ад работы на конях. Апрача таго, я азнаёмілася з матэрыяламі Наркамфіна БССР.

У нас, у Студзяноўскім сельсавеце, аднаасобнікі выкарыстоўваюць сваіх коней на перавозку лесу, тавараў, дроў і т. д. Апрача таго, некаторыя аднаасобнікі гандлююць коньмі.

Заработкі гэтых аднаасобнікаў вельмі значныя.

Аднаасобнікі ў Беларусі засяваюць усяго толькі 3 проц. пасеўнай плошчы, а коней у іх звыш 50 тысяч. Зусім ясна, што гэтыя коні выкарыстоўваюцца не для сельскагаспадарчых работ у аднаасобных гаспадарках, а для спекуляцыйных мэт, для нажывы.

Пры вывучэнні заработкаў аднаасобнікаў у Бабруйскім, Рагачоўскім, Віцебскім, Барысаўскім, Рэчыцкім, Гомельскім, Магілеўскім, і інш. раёнах высветлілася, што аднаасобнікі гэтых раёнаў зарабляюць на конях не ў сваёй гаспадарцы ад 8 да 14 тысяч рублёў у год.

Усе гэтыя даныя гавораць аб тым, што праект закона трэба адобрыць. Ён цалкам адказвае пажаданням шырокіх мас калгаснікаў.

Намечаныя праектам закона стаўкі падатку па Беларускай рэспубліцы—400 рублёў для першай групы, 500 рублёў для другой групы на аднаго каня, а таксама за кожнага наступнага каня звыш адной галавы 700 рублёў для першай групы і 800 рублёў — для другой групы — з'яўляюцца, па маёй думцы, правільнымі. Іх трэба зацвердзіць без змен.

Я лічыла-б неабходным унесці дадатак да праекта закона па поваду парадку спагнання падатку з тых гаспадарак, якія своечасова яго не выплачваюць. У праекце гэты пункт адсутнічае.

Тав. Угараў правільна гаварыў аб тым, што для сялян шырока адкрыт шлях да заможнага і культурнага жыцця ў калгасе. На самай справе, у нашай вёсцы асталіся толькі 3 аднаасобныя гаспадаркі. Усе астатнія гаспадаркі ўвайшлі ў калгас. Той, хто працуе чэсна, той жыве добра і становіцца актыўным барацьбітом за ўмацаванне калгасаў, той актыўна ўдзельнічае ў выкананні задач, пастаўленых нашай партыяй, урадам, таварышам Сталіным.

У нас, у БССР, каля 10.000 калгасаў, 215 МТС, 8.140 трактароў, 1.000 камбайнаў, каля 4.000 малатарань, 3.500 аўтамашын, 1.200 ільнацерабілак і іншых сельскагаспадарчых машын.

У нас многа зямлі, лесу і торфу. У нас многа аграномаў, заатэхнікаў, ветэрынарных урачоў, механікаў, трактарыстаў, камбайнераў. У нас сотні тысяч калгаснікаў і калгасніц, авалодаўшых навейшай агратэхнікай. У нас ёсць усё для заможнага і культурнага жыцця ў калгасе. У нас ёсць большэвіцкая партыя, у нас ёсць совецкая ўлада, у нас ёсць наш родны і вялікі Сталін, які вядуць нас да новых і новых перамог на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва.

Няхай жыве вялікі Сталін!

(Шумныя апладысменты.)

Другая Сесія Вярхоўнага Совета СССР.
На здымку: Дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР ад УССР Марыя Дземчэнка (злева) і Паўліна Панчэнка ў Крэмлі да пачатку Сесіі.
Фото Д. Халіпа. (Саюзфото).

Прамова дэпутата ЛЁЛІНАЙ Н. С.

У спрэчках па дакладу аб праекце закона „АБ ДЗЯРЖАЎНЫМ ПАДАТКУ НА КОНЕЙ АДНААСОБНЫХ ГАСПАДАРАК".

Таварышы дэпутаты Вярхоўнага Совета! Учора дэпутат Угараў далажыў нам праект закона „Аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак".

Неабходнасць выдання такога закона вынікае са шматлікіх патрабаванняў калгаснікаў аб тым, каб спыніць скарыстанне коней аднаасобных гаспадарак у спекуляцыйных мэтах, у мэтах нажывы.

Сялянства Совецкай Беларусі, як і ўсё сялянства нашага Совецкага Саюза, у велізарнай сваёй большасці з'яўляецца калгасным.

Векавая галеча і крывавая барацьба беларускага сялянства за зямлю знайшла сваё вырашэнне толькі ў рэзультаце Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, вызваліўшай беларускі народ ад гнёту памешчыкаў, польскіх паноў, ад здзекаў царскіх чыноўнікаў і ад кулацкай кабалы.

Калгасны лад стаў непахіснай асновай заможнага, культурнага і шчаслівага жыцця калгаснага сялянства. Сталінскі статут сельскагаспадарчай арцелі, у якім адлюстраваны ўсе інтарэсы калгаснага сялянства, накіроўвае жыццё калгасаў па шляху новых і новых перамог.

У сваёй гістарычнай прамове на Першай Усесаюзнай нарадзе стаханаўцаў таварыш Сталін гаварыў: „Характэрная асаблівасць нашай рэволюцыі заключаецца ў тым, што яна дала народу не толькі свабоду, але і матэрыяльныя багацці, але і магчымасць заможнага і культурнага жыцця".

Праўдзівасць сталінскіх слоў адчувае разам з усімі народамі Совецкага Саюза і наш беларускі народ.

Я сама—калгасніца. Цяпер працую старшынёй райвыканкома і бачу і радуюся таму, як з кожным днём нашы калгасы робяцца ўсё багацей, а калгаснікі—заможней.

Калгаснае сялянства пераканалася ў тым, што калгасны шлях—ёсць адзіны шлях да заможнага, культурнага і шчаслівага жыцця.

На аснове перадавой тэхнікі, якой аснашчаны нашы калгасы, беларускія калгаснікі дабіліся ў гэтым годзе небывалага яшчэ ў Беларусі сталінскага ўраджаю. У рэзультаце гэтага калгаснікі атрымаюць высокую ацэнку сваіх працадзён.

Пад кіраўніцтвам нашай вялікай партыі Леніна—Сталіна, совецкага ўрада, дзякуючы бацькоўскім клопатам аб беларускім народзе нашага вялікага Сталіна, калгаснікі Беларусі даб'юцца яшчэ большых рэзультатаў у сваёй рабоце.

Але побач з калгасамі існуюць і гаспадаркі аднаасобнікаў. Існаванне аднаасобнай гаспадаркі дапускаецца нашай Сталінскай Канстытуцыяй. У артыкуле 9 Канстытуцыі СССР запісана:

„Побач з соцыялістычнай сістэмай гаспадаркі, якая з'яўляецца пануючай формай гаспадаркі ў СССР, дапускаецца законам дробная прыватная гаспадарка аднаасобных сялян і саматужнікаў, аснаваная на асабістай працы і выключаючая эксплаатацыю чужой працы".

Аднак, аднаасобныя гаспадаркі, якія маюць коней, скарыстоўваюць іх не столькі ў сваёй гаспадарцы, колькі ў мэтах спекуляцыйнай нажывы.

Па нашаму і па іншых раёнах ёсць рад выпадкаў невыканання аднаасобнікамі дзяржаўных абавязацельстваў па дарожнаму будаўніцтву, грашовых плацяжах, мясапастаўках і т. д., у той час, як калгасы і калгаснікі поўнасцю і акуратна выконваюць свае абавязацельствы перад дзяржавай.

З боку аднаасобнікаў ёсць выпадкі ўтойвання ад дзяржавы неземляробчых даходаў. Вазьму, напрыклад, наш раён. За запашку агарода рабочаму аднаасобнік бярэ з яго ад 100 да 200 рублёў у дзень, за прывоз аднаго воза дроў аднаасобнік бярэ 30—40 рублёў. Аднаасобнікі перавозяць тавар для спажыўкааперацыі і бяруць прыватныя падрады на лесараспрацоўках, торфараспрацоўках. Усё гэта дае даход аднаасобніку ад 7 да 10 і больш тысяч рублёў у год. Пры гэтым, фінансавым органам не заўсёды ўдаецца поўнасцю ўстанавіць крыніцы і суму такіх даходаў аднаасобнікаў.

На практыцы такія ўмовы ставяць аднаасобнікаў у пераважнае становішча перад калгаснікамі, што, безумоўна, у некаторай ступені адбіваецца на дысцыпліне некаторых няўстойлівых калгаснікаў.

Ёсць выпадкі па Асіповіцкаму і Клічаўскаму раёнах БССР, калі асобныя калгаснікі таксама куплялі коней у сваё асабістае карыстанне.

Калгаснікі паўсямесна ўзнімаюць перад совецкімі арганізацыямі пытанне аб неабходнасці выдання такога закона, які спыніў-бы спекуляцыйнае скарыстанне коней аднаасобнымі гаспадаркамі.

Унесены законапраект „Аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак" я цалкам падтрымліваю і адабраю. Упэўнена, што гэты закон будзе прынят Сесіяй Вярхоўнага Совета аднагалосна, бо ён цалкам і поўнасцю адпавядае шматлікім патрабаванням калгаснікаў.

Прыняцце такога закона яшчэ раз пакажа вялікія клопаты аб калгасніках, ажыццяўляемыя нашым совецкім урадам, нашай партыяй Леніна—Сталіна і нашым дарагім, любімым правадыром і настаўнікам—таварышам Сталіным. **(Апладысменты).**

Мы — дочкі Радзімы

Мы, як і сотні тысяч совецкай моладзі, любім вайсковую справу і імкнемся ёю авалодаць.

У пачатку 1937 года мы паступілі ў Віцебскі аэраклуб без адрыву ад вытворчасці. Вучыцца і работаць было не лёгка, але комсамольскае племя цяжкасцей не баіцца. Мы перамаглі іх. З кожным днём усё больш і больш сур'ёзна браліся за вучобу, авалодвалі тэорыяй лётнай справы.

З першых дзён вучобы наша насценгазета „Вылёт" пісала аб нас, як аб лепшых курсантах аэраклуба, выдатніках вучобы. Гэта нас яшчэ больш бадзёрыла. Мы рашылі лётную справу здаць таксама, як і тэорыю, на „выдатна".

15 красавіка мы ў першы раз вышлі на аэрадром. Самалёт і ўсё акаляючае было для нас дзіўным і першы палёт здаваўся чымсьці гераічным. Не верылася, што, падняўшыся ў паветра, мы самастойна зможам ляцець, што мы самі будзем кіраваць гэтай сталёвай птушкай, што яна ў хуткім часе будзе таксама падпарадкавацца і нам, як інструктару.

Пасля 70 палётаў з інструктарам мы вылецелі самастойна. А як было лёгка на сэрцы, калі інструктар сказаў: „Тав. Суслапарава, тав. Зайцэва, вы сёння ляціце адны, машыны вам давяраю". Нам хацелася зрабіць першы самастойны палёт з выдатнай ацэнкай. І наша мэта была дасягнута. Цяпер мы ўжо лятаем самастойна, маем па 80 палётаў. За выдатныя паказчыкі вучобы і лётнай практыкі нам прысвоена званне выдатнікаў вучобы з занясеннем на дошку гонару аэраклуба. Гэта нас абавязвае мець яшчэ лепшыя рэзультаты ў лётнай справе. Мы абавязаліся не мець парушэнняў лётнай інструкцыі, добрасумленна адносіцца да агляду матэрыяльнай часткі самалёта—матора, здаць тэорыю і практыку на „выдатна"—і гэта будзе адным з лепшых падарункаў мацеры-радзіме да дня 20-годдзя Ленінскага комсамола.

Мы яшчэ лепш аўладаем лётнай справай, у любую мінуту па першаму закліку партыі і ўрада, не шкадуючы сіл і жыцця, станем на абарону совецкіх рубяжоў.

Няхай памятаюць японскія самураі, няхай памятаюць фашысцкія бандыты, што моладзь краіны Советаў заўсёды гатова да абароны сваёй бацькаўшчыны.

Мы заклікаем усіх дзяўчат нашай ордэнаноснай Беларусі ўступаць і мацаваць рады асоавіяхімаўскай арганізацыі, авалодваць лётнай справай, каб у моцным звяне гордых сокалаў нашай краіны стаць на варце бацькаўшчыны большэвізма.

Вучлёты Віцебскага аэраклуба:

Суслапарава, Зайцэва.

На здымку: Вучаніца Віцебскай шостай чыгуначнай школы Зайцэва П. Г., авалодаўшая лётнай справай на „выдатна".

Фота Почкаева. (Саюзфото).

На здымку: Група дзяўчат асоавіяхімаўскай арганізацыі Віцебскай фабрыкі „КІМ" накіроўваюцца ў лагер.

Фота Почкаева (Союзфото).

Моладзь рыхтуе падарункі

Па ўсіх вугалках нашай неабсяжнай квітнеючай радзімы ідзе актыўная падрыхтоўка да XX-годдзя дважды ордэнаноснага Ленінска-Сталінскага комсамола. Прызыў комсамольцаў-стаханаўцаў аўтазавода імя таварыша Сталіна (г. Масква) дастойна сустрэць слаўны юбілей і прыпаднесці падарункі радзіме-маці знайшоў свой гарачы водгук сярод усіх комсамольцаў і несаюзнай моладзі.

На Віцебскай трыкатажна-панчошнай фабрыцы „КІМ", вырасшай за годы двух сталінскіх пяцігодак, працуе пераважна моладзь.

Ніжэй мы друкуем выступленні асобных комсамолак, у якіх яны расказваюць аб сваёй падрыхтоўцы да XX-годдзя Ленінскага комсамола.

Комсамольцы—перадавікі

Міжнародны юнацкі дзень—свята працоўнай моладзі ўсяго свету. Мільёны юнакоў і дзяўчат нашай краіны ў гэты дзень дэманструюць сваю гатоўнасць абараніць цудоўнае жыццё савецкіх грамадзян, сваю згуртаванасць і адданасць вялікай партыі Леніна—Сталіна.

Наша комсамольская арганізацыя рыхтавалася сустрэць Міжнародны юнацкі дзень дастойна, з новымі высокімі паказчыкамі работы. Усю падрыхтоўку да гэтага дня мы ўвязвалі з агульнай падрыхтоўкай да набліжаючагася 20-годдзя Ленінскага комсамола. Мы, як і сотні тысяч савецкай моладзі, рыхтуем дастойныя падарункі маці-радзіме.

Аграмадны палітычны ўздым адчуваецца сярод комсамольскай і несаюзнай моладзі на фабрыцы. Кожны імкнецца лепш працаваць, лепш вучыцца. Вось маладая комсамолка Ніна Камароўская. Яна адна з лепшых стахановак швейна-кецельнага цэха. За змену яна выпрацавала 92 дзесяткі пар дзіцячых панчох, перавысіўшы выкананне плана больш чым на 200 процантаў. Комсамолка Тэця Падскочэва адна з ініцыятараў стаханаўскага руху на фабрыцы. Па кетлёўцы панчох яна ўстанавіла ўсебеларускі рэкорд. Комсамольская арганізацыя рамонтна-механічнага цэха ў азнаменаванне свята з 1 верасня арганізоўвае стаханаўскі дэкаднік.

Вялікую ўвагу мы ўдзяляем росту арганізацыі. За апошні час прынялі ў комсамол 400 чалавек. У нашы рады ўліліся лепшыя стаханаўкі і стаханаўцы фабрыкі. Вось узяць, напрыклад, тт. Прыжывальскую і Марусю Багачову. Прыжывальская на фабрыку прышла 5 год таму назад малапісьменнай вясковай дзяўчынай. На рабоце вырасла, вучылася і цяпер з'яўляецца лепшай стаханаўкай вязальнага цэха. Тав. Багачова—стаханаўка швейна-бельявога цэха. Займаецца ў стаханаўскай школе. Нядаўна прынята ў комсамол і Ніна Камароўская.

На фабрыцы шырока разгорнута абаронная работа. Амаль кожны комсамолец мае па некалькі абаронных значкоў. Елена Ерашэўская—значкістка пяці абаронных значкоў. Тав. Туркоўская — камандзір узвода. Яна абавязалася, выехаўшы ў лагер Асоавіяхіма, дабіцца таго, каб увесь узвод стаў значкістамі супроцьпаветранай хімічнай абароны. Ёсць у нас і вучлёты і парашутысткі.

Гарачы патрыятызм да сваёй радзімы асабліва ярка праяўляецца ў нас у сувязі з наглай правакацыяй японскай ваеншчыны на Далёкім Усходзе. Не таптаць фашысцкаму боту свяшчэннай совецкай зямлі! Моладзь фабрыкі „КІМ" гатова змяніць станок на баявую зброю.

Макарава

сакратар комсамольскага камітэта.

МОЙ ПАДАРУНАК РАДЗІМЕ-МАЦІ

Я доўга думала, які падарунак я магу даць радзіме-маці ў гонар 20-годдзя Ленінскага комсамола. Вырашыла азнаменаваць гэты слаўны юбілей рэкордам па выпрацоўцы дзіцячых панчох.

На агульным сходзе комсамольцаў нашага цэха я ўзяла на сябе абавязацельства—выпрацаваць за змену 90 дзесяткаў пар панчох. Сваё абавязацельства я перавыканала, зрабіла за змену 91 дзесятак, што складае выкананне плана звыш як на 200 процантаў.

10 жніўня мой рэкорд перакрыла Ніна Камароўская, даўшы за змену 92 дзесяткі пар дзіцячых панчох. І я рашыла, што хоць гэта ўсебеларускі рэкорд, аднак гэта не прэдзел, пяршынства абавязкова павінна быць за мной. Я паставіла перад сабой задачу абагнаць Ніну Камароўскую і выпрацаваць 95 дзесяткаў пар. Сваёй мэты я дасягну.

З першых дзён зараджэння стаханаўскага руху я па прыкладу перадавых людзей Совецкай Беларусі з'явілася ініцыятарам стаханаўскага руху ў нас на фабрыцы. Я стала першая выпрацоўваць па 70 дзесяткаў пар дзіцячых панчох. У мінулым годзе я давала за змену 80 дзесяткаў. Гэта лічба была тады рэкорднай. Свой метад работы я перадавала падругам і другім дзяўчатам швейна-кецельнага цэха. Я спадзяюся, што праз некаторы час такую колькасць будуць выпрацоўваць многія работніцы нашай фабрыкі.

Аддана працаваць, устанаўляць рэкорды для радзімы-маці нас натхняе вялікі правадыр працоўнага народу, тварэц нашага шчасця—наш родны Іосіф Вісарыёнавіч Сталін.

Тэця Падскочэва—

стаханаўка фабрыкі „КІМ"

радзіме-маці

На новай рабоце

На панчошна-трыкатажную фабрыку „КІМ“ я паступіла вучаніцай у 1932 годзе. Тады на вытворчасці налічвалася не больш 20—30 машын. За годы сталінскіх пяцігодак непазнавальнай стала фабрыка, выраслі і яе кадры. Да прыкладу я бяру сябе.

Першы час я была вучаніцай кетлёўшчыцай. З работай не спраўлялася, план не выконвала. Але праз некаторы час справа наладзілася. Я прыглядалася, як працуюць другія работніцы, звяртралася за дапамогай. Яны вучылі мяне і я авалодала працэсам вытворчасці. Пачала выконваць план, потым перавыконваць яго, а ў 1935 годзе, як лепшую ўдарніцу, мяне вылучылі кантралёрам брыгады. На новай рабоце я таксама сябе апраўдала.

У мінулым годзе мяне прызначылі начальнікам змены. Страшна было прыступіць да работы. Думала, што не спраўлюся, бо змена была самай адстаючай. Амаль увесь год не выконвалі план. Працоўная дысцыпліна адсутнічала. Але-ж большэвікі не баяцца цяжкасцей. І я па-стаханаўску ўзялася за работу. Папрацаваць, праўда, прышлося многа, затое сваёй мэты—вывесці змену ў перадавыя—я дабілася.

Зараз мая змена перадавая па цэху. Выросла многа новых стаханавак. Людзі, якія раней не выконвалі нормы, устанаўліваюць рэкорды.

Вось тав. Правалінская. Яна за змену выпрацоўвае па 78 дзесяткаў пар мужскіх наскоў, замест нормы—45. Ад яе не адстаюць тав. Валентовіч і іншыя дзяўчаты-комсамолкі.

Гэта толькі адзінкі з таго слаўнага, што ў нас маецца ў рабочым калектыве. Аднак магчымасці для вылучэння жаночых кадраў на фабрыцы далёка яшчэ не скарыстаны. Ёсць у нас многа выдатных здольных жанчын, якія могуць быць добрымі кіраўнікамі.

Надзя Чэркасава.

Комсамолка швейна-кецельнага цэха т. Падскочэва Т. К. на кетлёўцы дзіцячых панчох устанавіла ўсебеларускі рэкорд. Замест нормы 45,5 дзесятка панчох яна закетлявала ў змену 91 дзесятак.

На здымку: т. Т. К. Падскочэва. (Саюзфото).

АПРАЎДАЦЬ ВЫСОКАЕ ЗВАННЕ

Я з дзяцінства імкнулася быць інжынерам. Мая мэта збылася. Па сканчэнні Маскоўскага тэкстыльнага інстытута я атрымала званне інжынера.

З пачатку мінулага года работаю на Віцебскай трыкатажнай фабрыцы „КІМ“ у фарбавальным цэху інжынерам-эканамістам. Работа мая адказная і я стараюся апраўдаць званне советскага інжынера.

Я вельмі ўдзячна комуністычнай партыі і совецкаму ўраду, асабліва нашаму мудраму правадыру таварышу Сталіну за велізарныя клопаты аб моладзі.

Пасля 7 месяцаў упартай работы на вытворчасці мяне вылучылі намеснікам начальніка швейна-тэкстыльнага цэха.

Кіраваць тысячным калектывам рабочых—вялікі гонар. Я імкнуся апраўдаць аказанае мне давер'е.

У нашым цэху яшчэ да гэтага часу ёсць некаторыя недахопы, якія неабходна зжыць. Былі выпадкі замасленасці гатовай прадукцыі. Я са старшым майстрам цэха ўстанавілі спецыяльную прыладу для адводу адпрацаванага масла з машыны. Гэта значна знізіла замасленасць панчошных вырабаў.

Да 20-годдзя Ленінскага комсамола я абавязалася вывесці цэх у перадавы па фабрыцы. Спадзяюся, што гэта абавязацельства выканаю з гонарам.

Роза Апарцава—
інжынер фабрыкі „КІМ“.

ЦУДОЎНАЕ ЖЫЦЦЁ

У Сталінскай Канстытуцыі запісана: „Абарона бацькаўшчыны ёсць свяшчэнны абавязак кожнага грамадзяніна СССР“.

Я гэтыя залатыя словы добра памятаю. Без адрыву ад вытворчасці скончыла курсы парашутызма. З якой радасцю я сустрэла той дзень, калі ўпершыню зрабіла прыжок.

Я добра падрыхтавана да абароны сваёй радзімы і радуюся, што здала норму на пяць абаронных значкоў: ГПА, ГСА, ППХА, Варашылаўскага стралка і парашутыста. Цяпер авалодваю лётнай справай. Адзнакі ў мяне не ніжэй, чым „добра“. Але нельга сказаць, што толькі адна я такая. Не, у нас ёсць яшчэ сотні і тысячы такіх дзяўчат, якія прыгаюць з парашутам, лётаюць у воблаках, якія метка страляюць. Я падрыхтоўваюся да XX гадавіны Ленінскага комсамола здаць норму на Варашылаўскага стралка другой ступені.

У Віцебскім аэраклубе вучыцца многа моладзі, якая ў любую мінуту гатова стаць на абарону радзімы. Многа дзяўчат сумесна з юнакамі вывучаюць авіяцыйную тэхніку, і не толькі авіяцыйную, але і наогул ваенную справу.

У нас ёсць свой стадыён—стадыён фізкультурнага таварыства „Праца“. На гэтым стадыёне мы—маладыя дзяўчаты—стаханаўкі фабрыкі „КІМ“ пасля работы займаемся фізкультурай. Трэніруемся па бегу, па прыжках у вышыню і ў даўжыню, кідаем гранаты, дыскі і інш. Арганізоўваем спаборніцтвы, кросы. Я таксама і актыўная ўдзельніца мастацкай самадзейнасці. Пры фабрыцы ў нас ёсць батальён ППХА. У ім я састаю камандзірам. Работа гэта вялікая і пачэсная.

Толькі ў нас, у краіне Советаў, адкрыты шырокія дарогі для вучобы, для шчаслівага жыцця здаровай, мужнай, совецкай моладзі.

Я нарадзілася ў 1918 годзе ў сям'і бедняка-селяніна. З роднымі пажыла не доўга. Яшчэ была маленькай, калі памёрла маці, а бацька мяне кінуў. Я выхоўвалася ў дзіцячым доме, і дзякуючы клопатам партыі і ўрада зараз жыву весела і шчасліва.

Няхай не думаюць праклятыя ворагі парушаць нашы свяшчэнныя граніцы. Наша краіна непераможна. Наша армія дасць ворагам сакрушальны адпор. Наша моладзь грудзьмі стане на абарону свайго радаснага жыцця.

Елена Ерашэўская.

ПАДРЫХТАВАНА СУСТРАКАЕМ ВУЧНЯЎ

З раніцы ва двары школы чуцен гул дзіцячых галасоў. Яшчэ не пачаліся заняткі ў школе. Але спраў у рэбят шмат. Толькі і размовы аб занятках, аб новых кніжках, аб прайшоўшым леце.

Рэбята загарэлыя, вясёлыя, з новымі сіламі і жаданнем вучыцца толькі на „добра“ і „выдатна“, прыходзяць рэгістрыравацца ў школу. Былая акраіна г. Менска, Кальварыя, дзякуючы сталінскім клопатам аб патрэбах народнай асветы, мае добрую светлую Сталінскую школу.

Яшчэ памятаюць старэйшыя рэбяты, як ім прыходзілася з далёкай Весялоўкі і Людаманта хадзіць у школу за 5 кілометраў.

Тут, на Кальварыі, школа стала для рэбят і культурным ачагом. Акрамя вучэбных заняткаў рад самых рознастайных гурткоў работалі ў мінулым годзе і будуць работаць і ў гэтым навучальным годзе. Рэбяты і ўся кальварыйская ваколіца сапраўды ганарацца школьным джазам і рэзультатамі работ мастацкага гуртка. Малюнкі рэбят, развешаныя ў школе, сведчаць аб растучых талентах.

Школа падрыхтавалася да прыняцця навічкоў і да пачатку навучальнага года. Утворан рамонт ва ўсім памяшканні. Пафарбаваны падлогі, дзверы, вокны і парты. 90 чалавек навічкоў прымаем у першыя класы. Усяго ў школе 23 класы.

Клапатліва і ласкава праводзіла школа сваіх першых выпускнікоў. 16 выпускнікоў пайшлі ў ВНУ, 2 у ваенныя школы. Па маючыхся звестках, усе яны вытрымалі іспыты. Гэта гаворыць аб тым, што школа справілася з сваёй задачай, што рэбяты ўсвоілі праграму.

Школа цалкам укамплектавана кваліфікаванымі настаўнікамі. З новымі сіламі, з новай энергіяй бярэмся мы за работу. Прыкладзем усе сілы, каб яшчэ лепш закончыць будучы навучальны год, каб цалкам ліквідаваць другагодніцтва.

Дырэктар 37-й школы
Ольга БУЛКО.

Менск.



Група комсамольцаў-стаханаўцаў Бабруйскай мэблевай фабрыкі імя Халтурына (злева направа): А. А. Харлінскі, Е. К. Міхно, М. П. Шпаткоўская і І. Х. Чэрнякоў. Фота Л. Мазэлева (Саюзфото).

На трамвайнай лініі — КОМСАМОЛЬСКІ ПОЕЗД

Трамвай у Менску існуе нямнога больш дзесяцігоддзя. Трамвайныя лініі пабеглі па гарыстых вуліцах горада ўжо ў гады совецкай улады. Губернскі Менск „славіўся“ дапатопнай конкай, якую мог абагнаць любы пешаход. Гісторыю твамвая добра ведаюць у Менску, але лепш другіх яе ведаюць самі трамвайшчыкі. У вольную мінуту са смехам яны вам раскажуць аб тым, як у стары час губернская ўправа амаль сотню рашэнняў прыняла: „пабудаваць трамвай“, але далей паперы справа ні на шаг не пайшла.

Той, хто бываў у Менску, хто жыве ў сталіцы, не́раз і не два любаваўся, як па галоўнай вуліцы горада часамі пазваньвае і па-майстэрску застанаўліваецца на астаноўках, а затым імчыцца далей комсамольскі поезд. У трамвайшчыкаў поезд—гэта два сцэпленых паміж сабой вагоны. Комсамольскі поезд ззяе свежай афарбоўкай, наперадзе ззяе звязда. Чыстыя, акуратна выцертыя шыбы... Іх два на Менскіх трамвайных лініях № 33 і № 34 і створаны яны па ініцыятыве комсамольскага камітэта з мэтай лепшага абслугоўвання працоўных.

З работай трамвая сутыкаюцца сотні тысяч чалавек. Менскі трамвай за адзін дзень перавозіць дзесяткі тысяч пасажыраў. Яны спяшаюцца на работу, па службовай справе, з работы дамоў. Яны хочуць адпачнуць у пуці—пачытаць газету, у многіх у руках кнігі. І многія з пасажыраў знарок прапускаюць вагон, каб дачакацца комсамольскага поезда. Поезд гэты добра ведаюць, хоць і курсіруе ён па Менскіх лініях не так ужо даўно—з мая 1938г. Пуск яго быў падарункам Першаму Маю.

Трамвайшчыкі работаюць на-віду. Ледзь што здараецца—грубае абслугоўванне пасажыра, аварыя—гэта адразу-ж становіцца вядомым. Комсамольскі поезд абслугоўваецца пазменнымі брыгадамі. Такіх брыгад тры і ў кожнай па 3 чал. Ёсць у брыгадах і беспартыйная моладзь—заўтрашнія комсамольцы. Важатыя Лютынская, Вазерава і кандуктары Лысковая, Кунсевіч, Каганова працуюць на поездзе № 33; на поездзе № 34 важатыя—Мілешка К., Сержановіч. З 5 гадзін 40 мінут раніцы да позняга вечара іх вагоны знаходзяцца на лініі.

Дзесяткі пасажыраў заходзяць у вагон, дзесяткі сходзяць. За ўсе месяцы работы брыгады не маюць ніякіх скарг. У вагоне пасажыра чакае далікатны падыход, кандуктар сочыць, каб лепш былі выкарыстаны месцы, аб'яўляе астаноўкі, растлумачвае прыезджым, як ім дайсці па адрасу. І ўсё гэта спакойна, дзелавіта, не нервуючыся, не агрызаючыся...

Раней чым дабіцца права весці комсамольскі поезд моладзь праходзіла курсы. Вучыліся добра. Вагон кожнаму знаём, як той маршрут, па якому ён следуе дзесяткі разоў. І Лютынская, і Лысоўская, дзяўчаты-вагонаважатыя, ведаюць механічнае абсталяванне вагона, правілы эксплаатацыі, хуткасць, якую патрэбна развіваць у шляху. А гэта—галоўнае. Лісоўская сумяшчае работу з вучобай. Грамадскім жыццём, палітычнымі пытаннямі цікавяцца ўсе члены брыгады, і часта можна бачыць, як раніцой, яшчэ да выхада вагонаў з парка, дзяўчаты ажыўлена талкуюць аб прачытаным ва ўчарашніх газетах.

Воляю большэвікоў ужо даўно дапатопная конка заменена цудоўным першакласным трамваем. Цудоўная тэхніка! Комсамольская моладзь дапамагае па-баявому выкарыстоўваць гэтую тэхніку з тым, каб працоўныя масы сталіцы БССР былі задаволены сваім трамваем.

Імчыцца 33-і поезд, за ім 34-ы... К слаўнаму юбілею Ленінска-Сталінскага комсамола маладыя трамвайшчыкі абавязваюцца яшчэ вышэй падняць якасць сваёй работы, зрабіць маладзёжныя паязды прыкладнымі, каб аб іх кожны мог беспамылкова сказаць:

— Вось так трэба работаць.

Е. Садоўскі

Вострыкава Вера Іванаўна—супрацоўніца ЦС Асоавіяхіма БССР, мае 3 абаронных значкі.

Фото Каплінскага.

НАРОДНАЯ настаўніца

Я з'яўляюся народнай настаўніцай. Народны настаўнік выхоўвае новых людзей, маладое пакаленне і ўпаўне заслужана часта можна пачуць ад педагога: „Гэты герой-пагранічнік—мой вучань; архітэктар, які пабудаваў прыгожы будынак,—мой вучань".

Работа педагога цяжкая, адказная, але вельмі пачэсная. Я ў гэтым на асабістым вопыце ўпэўнілася.

Калі я ўпершыню ўвайшла ў клас, на мяне глядзела 40 пар вачэй. Што рабіць з імі, добра я не ведала. Пачала знаёміцца з рэбятамі, наглядала, што іх цікавіць.

Першыя месяцы вельмі цяжка было наладзіць работу. Я пачала больш цікавіцца жыццём рэбят на-даму, як яны праводзяць час па-за школай, пачала збліжацца з вучнямі і іх бацькамі. Рэбяты і бацькі пачалі звяртацца да мяне з рознымі запытаннямі. Паступова сувязь паміж школай і домам наладжвалася.

Да заняткаў я заўсёды рыхтуюся. Раней чым ісці праводзіць лекцыю, чытаю метадычную літаратуру, прадумваю, як лепш прыпаднесці рэбятам даны матэрыял. Імкнуся падрыхтавацца да лекцыі ўсебакова, каб на зададзенае пытанне адказаць правільна і вычарпальна.

Якая ў мяне была глыбокая радасць, калі я адчула першыя рэзультаты работы. Дзеці навучыліся чытаць, пісаць, могуць пераказаць змест прачытанай кніжкі. У гэтым годзе ўжо вучні самі складаюць калектыўна маленькія апавяданні. Усе вучні майго класа чытаюць дзіцячую літаратуру па рэкамендуючаму спісу.

Рэбяты ў мяне на вачах растуць і змяняюцца. У першы год маёй работы вучаніцы Г. цяжка было спакойна ўседзець на месцы некалькі мінут. Сшыткі яе заўсёды былі запэцканы чарнільнымі і тлушчавымі плямамі. Я зацікавілася гэтай дзяўчынкай, часта гутарыла з ёю, уцягвала ў школьнае жыццё. Дзяўчынка змянілася. Цяпер яна з'яўляецца першай памочніцай ва ўсіх правадзімых мерапрыемствах.

Для павышэння паспяховасці я праводзіла дадатковыя заняткі з тымі, якія слаба ўсвоілі матэрыял. Рэбяты не адставалі і ад грамадскага жыцця краіны. Прымалі яны ўдзел і ў мастацкай самадзейнасці. У дзень святкавання Першага Мая сіламі вучняў нашага класа была пастаўлена п'еса.

Я прымаю актыўны ўдзел у грамадскім жыцці. Работала членам акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Вярхоўны Совет СССР і БССР. Па нашай акрузе балатыраваўся лепшы саратнік вялікага Сталіна—Лазар Майсеевіч Каганавіч. У галасаванні прынялі ўдзел 100 проц. выбаршчыкаў.

Я і вучуся ў педагагічным інстытуце. Заліковую сесію здала на „выдатна".

Сталінская Канстытуцыя дала нам такія правы, аб якіх марыла чалавецтва сотні год. Я работаю, вучуся, адпачываю. У гэтым годзе я аб'ехала паўднёвы бераг Крыма. Была ў былой царскай рэзідэнцыі, у Лівадзіі. Туды калісьці працоўных не дапускалі і блізка. Зараз гэта цудоўны курорт, у якім адпачываюць тысячы совецкіх людзей.

Добра адпачыўшы, з новымі сіламі, я сустракаю пачатак навучальнага года. З радасцю гляджу я на загарэлыя, здаровыя твары сваіх вучняў.

За работу, дарагія рэбяты! За вучобу!

Паіна В. С.

Гомель.



У піонерскім лагеры імя Н. І. Ежова работае авіямадэльны гурток. У гуртку работаюць 33 юных авіямадэлісты.

На здымку (злева направа): Валодзя Мігно, Алік Суркоў, Абраша Громаў і Рэма Уральскі запускаюць свае мадэлі.

Фото Л. Мазэлева. (Саюзфото).

КОМУНІСТКА Ў ДЭПО

Вялікім аўтарытэтам і павагай карыстаецца ў рабочых Менскага вагоннага дэпо Антаніна Александраўна Праліч.

У дэпо аб ёй гавораць, як аб адным з лепшых, адзыўчывых таварышоў. Да яе ідуць за растлумачэннем незразумелага пытання, за парадай па рабоце.

Гэта цяпер, а быў-жа час, калі раздаваліся насмешлівыя галасы:

— Слесар у спадніцы.

Так было. Гэты перажытак праклятага мінулага, што складаная слясарная работа не жаночая справа,—выкарыстоўваўся ворагамі народа, каб недапусціць жанчыну ў цэх, пазбавіць яе правоў, якія дала жанчыне Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя.

Многа чаго перажыла Антаніна Александраўна Праліч за 24 гады работы на чыгуначным транспарце. Гэтыя 24 гады абагацілі яе практычным вопытам. Яна прайшла складаны шлях ад прыбіральшчыцы да майстра па рамонту складаных ролікавых падшыпнікаў для вагонаў транссібірскіх паяздоў, да партыйнага кіраўніка.

Усё гэта заваёвана стаханаўскай работай у барацьбе за план, чулымі і ўважлівымі адносінамі да людзей і непрымірымай барацьбой з ворагамі народа.

Уступіўшы ў рады партыі Леніна—Сталіна тав. Праліч пасля работы, вечарам, у партыйнай школе авалодвала тэорыяй большэвізма. І кожны дзень, кожны занятак раскрывалі ёй вочы, каб глядзець на акаляючы свет па-новаму.

Вось чаму, калі па ўсёй нашай краіне шырокай хваляй разгарнуўся стаханаўскі рух, то тав. Праліч адной з першых на Менскім чыгуначным вузле пачала паказваць узоры ў рабоце.

І гэтая стаханаўская праца зараз-жа была заўважана любімым наркомам чыгуначнікаў таварышом Л. М. Кагановічам.

Антаніна Александраўна ўзнагароджваецца значком „Ударніку сталінскага прызыва".

Перасталі раздавацца насмешлівыя выгукі: „слесар у спадніцы". Зломлена недавер'е да здольнасцей жанчыны. У спаборніцтве на лепшую сустрэчу 20-годдзя Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі тав. Праліч дабіваецца таго, што вагоны з ролікавымі падшыпнікамі праходзяць шлях ад Менска да Владзівастока без рамонту і нарком адзначае гэту работу ўзнагароджаннем тав. Праліч значком „Почетному железнодорожнику."

Партыйная арганізацыя вагоннага дэпо выбірае яе членам парткома, а комуністы Менскага вузла абіраюць у члены вузлавога парткома.

Работы прыбавілася. Але гэта не страшыць Антаніну Александраўну. Яна ведае, што дрэнны той комуніст, які не змагаецца за тое, каб апраўдаць высокае давер'е мас.

У сябе ў цэху тав. Праліч узялася за арганізацыю правядзення штодзенных чытак газет. Кожны дзень у абедзены перапынак можна бачыць яе ў групе рабочых з газетай у руках. На сходах, мітынгах яна з усёй страснасцю большэвіка, як і на рабоце, заклікае рабочых змагацца за справу вялікай партыі Леніна—Сталіна, якая дала нам радаснае жыццё. Яна нясе большэвіцкую праўду ў масы.

Н. Стрэльчанка.

Першая жаночая паравозная брыгада.

14 жніўня з Масквы на станцыю Куроўскую на 1 гадз. 17 мін. раней раскладу прывяла поезд № 988 першая ў Совецкім Саюзе жаночая паравозная брыгада. Брыгаду ўзначальвала начальнік 1-га паравознага аддзялення Ленінскай чыгункі, ордэнаносец Зінаіда Троіцкая; памочнікамі машыніста работалі яе вучаніцы, комсамолкі Анна Кошкіна і Марыя Федосава.

На здымку: Ордэнаносец З. П. Троіцкая (злева) і М. І. Федосава.

Фото В. Олейніка. (Саюзфото).

ЗНІШЧЫЦЬ ПЕРАШКОДЫ Ў РАБОЦЕ

У механічным цэху цэментнага завода сярод рабочых толькі адна жанчына—я. На станку я работаю токарам. На завод паступіла ў 1936 годзе. Спачатку работала чорнарабочай у цэху Кар'ера, але я цікавілася машынамі, і мяне перавялі ў механічны цэх.

З самага пачатку за гэту работу я ўзялася шчыра і пачала авалодваць сваім станком. Я паставіла перад сабою задачу—стаць стаханаўкай і гэтага дабілася. У маі месяцы я сваё заданне выканала на 256 проц., а ў чэрвені на 258 проц. і, не гледзячы на тое, што я токар 3-га разрада, атрымала зарплату за чэрвень 338 рублёў.

Але гэтыя дасягненні мяне не задавальняюць. Я маю жаданне і магу дасягнуць значна большых вынікаў, аднак у механічным цэху не ствараюць мне належных умоў для стаханаўскай работы. Вось аб гэтым я і жадаю расказаць.

Усебеларуская нарада ордэнаносцаў, стаханаўцаў—перадавікоў жывёлагадоўлі.

На здымку: Група ўдзельнікаў нарады (злева направа): Н. А. Корунс (даярка калгаса „Чырвоны Кастрычнік", Петрыкоўскага раёна), В. Ф. Сатокіна і М. О. Самуценко (даярка калгаса „15-ы з'езд ВКП(б)", Лельчыцкага раёна) і Е. І. Ігнаценко (заг. СТФ калгаса імя Леніна, Васілевіцкага раёна).

Фото Л. Мазэлева. (Саюзфото).

У цэху я прадастаўлена сама сабе. Мне ні ў чым не дапамагаюць. Бывае выпадак, калі станок сапсуецца (а я яшчэ не ўсё магу зрабіць), тады я звяртаюся за дапамогай да загадчыка механічнага цэха тав. Грыгор'ева, але замест дапамогі чую рэзкі адказ: „ты токар, сама і раманту́й".

Іншы раз няма разца, прашу Грыгор'ева: „дайце разец, а то станок прастойвае", а ён мне ў адказ: „ну ідзі дамоў".

Апошні час я абтачвала падвескі, укладышы, восі, кольцы для шлямавых насосаў і іншыя дэталі, але Грыгор'еў нарадаў мне на гэтыя дэталі не выпісваў і я не ведала ні сваёй нормы, ні колькі я зарабіла. Карыстаючыся гэтым, ён часта маёй работы не запісваў.

А бывае і так. За абточку васей ваганетак мне выплачваюць 1 р. 16 кап., а калі ў другую змену стане за мой станок другі токар, то яму расцэнку павышаюць—плацяць па 1 р. 36 кап.

У сувязі з уходам на збор у Чырвоную армію тав. Грыгор'ева, часова прызначан загадчыкам механічнага цэха тав. Банчыкаў. Ён лепш адносіцца да работы і заўсёды выпісвае нарады. Але і зараз ёсць перашкоды ў рабоце. На 19 ліпеня я атрымала нарады і датэрмінова іх выканала. За гэты дзень, згодна нарадаў, я павінна была атрымаць 30 руб., але ў мяне прынялі нарады не ўсе, а на 8 руб. заставілі на руках і нарміроўшчык Штальц заявіў: „Табе столькі не палагаецца, ты шмат выпрацавала, ты павінна атрымаць 5 рублёў у сярэднім".

Калі да ўсяго гэтага дадаць, што ў цэху тэхмінімум не праводзіцца, мне ніхто не дапамагае і не цікавяцца маёй работай, то стане зусім зразумела, што трэба карэнным чынам змяніць такія адносіны да стаханаўцаў.

Галубцова Праскоўя Федотаўна—токар механічнага цэха Крычаўскага цэментнага завода.

Пашырыць дзіцячы асартымент

Мы, работнікі гандлю, асабліва адчуваем з кожным днём велізарны рост культурнага і заможнага жыцця нашага совецкага народа. Наш спажывец—гэта ўжо не той, які быў нават дзесяць год таму назад. Ён прыходзіць у магазін і жадае атрымаць для свайго дзіцяці высокай якасці касцюм, зграбныя бацінкі, цікавую і прыгожую цацку.

Совецкі пакупнік ацэньвае нашу работу, як і ўсёй сістэмы гандлюючай арганізацыі, па тым, як яго ўзросшыя патрэбнасці ўлічваюцца, як яны задавальняюцца, як культурна і ўзорна арганізован гандаль у магазіне, каб своечасова і без асаблівых цяжкасцей прыйсці і купіць усё неабходнае для свайго дзіцяці.

З магазінаў, гандлюючых дзіцячым асартыментам, у г. Менску асноўнымі з'яўляюцца магазін № 1 Менпромгандля і аддзяленне ГУМ'а. Я хачу на старонках журнала падзяліцца, як наш магазін Менпромгандля № 1 гандлюе дзіцячым асартыментам у сувязі з падрыхтоўкай да навучальнага года, як ён забяспечвае попыт пакупнікоў на адзенне, абутак і інш. для дзяцей школьнага ўзросту.

Апошнія два месяцы ўся наша работа сканцэнтравана на гэтым важнейшым участку. За трэці квартал наш магазін павялічыў абарот на 800.000 рублёў у параўнанні з другім кварталам. Галоўнае павелічэнне абароту мы маем за лік продажу за гэты час швейных вырабаў розных размераў, як-та: касцюмаў, паліто, плацця, абутку для дзяцей школьнага ўзросту. Аднак ні ў якім выпадку мы не супакойваемся, бо попыт яшчэ далёка не поўнасцю забяспечан.

Я павінен сказаць, што Белшвейснабзбыт нерэгулярна снабжае нас сваімі вырабамі. Асабліва вялікія перабоі маюцца ў летні час, калі швейныя фабрыкі маюць чарговы адпачынак. Белшвейснабзбыт і яго планіруючыя органы не ўлічваюць гэтыя абставіны. У выніку ў гэтыя месяцы ў магазіны тавараў зусім не паступае.

Таксама маецца рад недахопаў у галіне снабжэння і абуткам. Неакуратна нас снабжае дзіцячым абуткам Белскурснабзбыт. Падчас засылаюцца такія нумары абутку, на якія няма попыту, а наадварот такія размеры, як нумар 36—хлапчуковы, на якія попыт вельмі вялікі, мы атрымліваем зусім у абмежаванай колькасці.

Цяпер мы ўзмоцнена рыхтуемся да вялікага школьнага базара, які павінен адчыніцца ў сувязі з падрыхтоўкай да навучальнага года. Выйдзем на яго з вялікім асартыментам тавараў.

Побач з гэтай важнейшай работай па падрыхтоўцы к навучальнаму году мы ні на мінуту не забываем, што мы таксама павінны забяспечыць насельніцтва таварамі для дзяцей няшкольнага ўзросту. І ў гэтай галіне мы да гэтага часу маем рад істотных недахопаў. Вось узяць хоць-бы такі асартымент тавараў, як дзіцячыя шэрсцяныя трыкатажныя касцюмы (медзвяжонкі), рэйтузікі, касцюмы лыжныя для 6—9-гадовага ўзросту. Нас такімі таварамі зусім не снабжаюць. Адсутнічаюць таксама пальчаткі з пальчыкамі, іх нават чамусьці спынілі выпускаць на вытворчасці.

Альбо такіх рэчаў, як шаўковыя дзіцячыя шапачкі, паліто нумары 20—22 для дзяўчынак у продажы зусім не знойдзецца. Не лепшае становішча з абуткам для дзяцей маленькага ўзросту. А між тым, попыт на ўсе гэтыя тавары вельмі вялікі.

Работнікі прылаўка кожную мінуту і кожны час выслухоўваюць ад пакупнікоў правільныя заўвагі на недахоп гэтых тавараў. Мы ў сваю чаргу заяўляем аб гэтым Белснабзбыту і Скурснабзбыту, але да нашага голасу не прыслухоўваюцца.

Наша задача ў бліжэйшы час дабіцца такога становішча, каб забяспечыць пакупнікоў усімі неабходнымі таварамі для нашых дзяцей—цудоўных сталінскіх пітомцаў.

С. Каждан.

На здымку: вучаніца 4 класа Загаранскай няпоўнай сярэдняй школы, Віцебскага раёна, Лысенка Валя за зборам памідор у калгасе ім. Кірава. (Саюзфото)

СУСТРЭЧА *у турме*

Турэмная надзіральніца ўзяла цяжкую звязку ключэй, і, грымячы імі, адчыніла дзверы.

— Калі ласка,—запрасіла яна, насмешліва ўхмыляючыся.

Дзяўчына зрабіла два кароткіх, нерашучых крокі ўперад і застанавілася. Дзверы з шумам захлопнуліся за яе спіной.

— Добры дзень...—пачуўся яе ціхі голас.

— Дабро пажалаваць у турму Барнімштрасе,—прагучэў адказ.

Прышоўшая павольна павярнула галаву. На верхняй нары ляжала маладая жанчына. Сваю чорнавалосую ўзлахмачаную галаву яна падпірала рукамі. Толькі цяпер новенькая змагла агледзець вакол два рады нар уздоўж сцен вялікага пакоя. На іх ляжалі дзяўчаты. Яны ўважліва разглядвалі ўноў прышоўшую. Дзве сядзелі каля стала, ледзь асветленага тусклым светам, пранікаўшым праз маленькае рашотчатае акно. Новенькая пад прыстальным поглядам адчула якоесьці хваляванне. Яе вочы бездапаможна скальзілі па радах нар.

— Вы сароміце яе сваімі поглядамі,—пачуўся чыйсці голас,—ну, падыйдзіце бліжэй.

Новенькая павярнулася да русавалосай дзяўчыны, якая рэзкім рухам спусціла ногі за край ложка і саскочыла на падлогу. Затым яна прысунула да сябе лаўку і запрасіла прышоўшую сесці.

— Як вас завуць?—ціха спытала яна.

— Гільда.

— А мяне завуць Эльза,—сказала русавалосая,—а вось гэта Люсі, гэта—Клара.

У Гільды злёгку кружылася галава.

— А чаму вы тут?

Гільда ўздрыгнула.

— Я тут таму, што ўдзельнічала ў палітычнай дзейнасці. А вы?

— Палітыка!—гучна ўсклікнула русавалосая.—Ха! Не, я не такая дурная. Гэта-ж не прыносіць даходаў.

Жанчыны наверсе зарагаталі.

Вочы Гільды расшырыліся ад жаху.

— Не трэба было гэтага гаварыць,—у думках папікнула яна сябе.—Франц-жа заўсёды мне сцвярджаў: ніколі не давяраць, не раскрываць сваіх карт да таго часу, пакуль не пазнаеш людзей.

— Мы тут усе крымінальныя. Вось Люсі. Яна вельмі глыбока заглянула ў кашалёк уладара піўной. Клара сцягнула мехавае паліто свайго гаспадара... Вельмі ўжо доўга пералічваць паходжанні гэтых маладых дзяўчат.

Дзяўчына ўзяла Гільду за рукі і асцярожна падпіхнула яе да стала. Другія дзяўчаты таксама стараліся абыходзіцца з ёй як мага лепш. Ёй станавілася ўсё цяплей.

— Крымінальныя, — думала Гільда.—Ці-ж можа гэта быць. Франц неаднаразова гаварыў: капіталістычнае грамадства ператварае значную частку людзей у крымінальных.

— Не заўсёды мы жывем добра,—прадаўжала Эльза,—але многія з нас маюць на свабодзе родных, якія падчас пасылаюць нам што-небудзь. У цябе таксама, мусіць, хто-небудзь ёсць?

Гільда апусціла галаву і задумалася.

— Вы ўжо даўно знаходзіцеся тут?—спытала яна.

— Некалькі тыдняў,—адказала Эльза.—Яна паглядзела на Гільду прыстальна і выпытваюча.—Вы арыштаваны ўпершыню?

— Так.

— Таму-то вы і знаходзіцеся ў такім затрудненні... І акрамя таго яшчэ з-за палітыкі... Як гэта здарылася?

У Гільды зноў успыхнула пачуццё недавер'я. Яна ўзглянула ў твар той, якая, здавалася, не была асабліва зацікаўлена ў адбываўшымся.

— Вы толькі што высмяялі мяне за мной удзел у рэволюцыйным руху,—пачала яна,—а мы-ж змагаемся таксама і за вас. Нішчата—вось галоўная прычына таго, што вы так нізка палі.

Пачалася доўгая гутарка. Эльза слухала сур'ёзна, задавала пытанні, час-ад-часу нахіляючы галаву ў знак разумення.

Гільда гаварыла з запалам, з энтузіязмам. Яна нават не заўважыла, як спыніліся прыватныя гутаркі. Дзяўчаты ўважліва слухалі. Яна расказала і аб сваім арышце: у яе знайшлі нелегальныя комуністычныя газеты.

Гільда скончыла гаварыць. Дзяўчаты падводзяць яе да вакна. Гільда глядзіць пытальна ў вочы Эльзы. Эльза падымае руку. Яе ўказальны палец накіраван скрозь пруцці рашоткі да процілеглага боку турэмнага двара.

— Там, наверсе, сядзела Роза Люксембург,—ціха вымаўляе яна. Мёртвае маўчанне.

— Вы ведаеце?—пытае, урэшце, Гільда.

— Мы ўжо даўно ведаем гэта... даўно... Мы тут усе—члены кампартыі.

Яна прыстальна глядзіць у твар Гільды.

— Мы толькі хацелі праверыць, хто ты... Яны-ж сюды, да нас, часта падсылаюць шпіёнаў...

Гільда моцна абнімае Эльзу.

(„Интернациональный Маяк").

Надакучлівая муха

Муху правільна называюць надакучлівай. Прагоніш яе—яна зноў прыляціць. Няма ад яе спакою. Але да мух прызвычаіліся, з іх прысутнасцю ў кватэры мірацца.

Чаму? Таму, што мух не баяцца. Іх лічаць надакучлівымі, непрыемнымі. І толькі.

Многія забываюць, а можа быць не ведаюць, што мухі значна небяспечней, чым аб іх думаюць.

Мухі небяспечны для здароўя. Бойцеся мух!

На лапках мухі іх выпаражненнях былі выяўлены мікробы цяжкіх хвароб. Палачкі брушнога тыфа могуць жыць у арганізме мухі і на лапках 11 дзён, туберкулёзныя мікробы—13 дзён; сібіраязвеныя споры могуць захоўваць сваю жыццездольнасць у целе мухі на працягу 20 дзён.

Муха распаўсюджвае не толькі гэтыя хваробы, але і дызентэрыю, дыфтэрыю, праказу, халеру.

Муха—небяспечнейшы разносчык цяжкіх хвароб. Асабліва небяспечны мухі для дзяцей.

Летам узмацняецца небяспека летніх дзіцячых паносаў. У іх распаўсюджанні вялікую ролю адыгрываюць мухі.

Беражыце дзяцей ад мух. Не давайце распладзіцца мухам.

Мухі выключна пладавіты. Адзін вучоны імкнуўся вылічыць, якое пакаленне можа даць за лета адна пара мух. Ён атрымаў вось які лік:

191 010 000 000 000 000 000 000.

Улюбёныя месцы для іх размнажэння — конскі памёт, выпаражненні, гной, папсаванае мяса, кухоннае смецце, памыі, раслінныя адкіды і т. д.

Сачыце за чыстатой ў жыллі і вакол яго.

Трымайце адкіды і смецце ў закрытым вядры. Глядзіце, каб прыбіральні і выграбы дэзінфіцыраваліся, ачышчаліся і паліваліся растворам хлорнай вапны. Мусарныя скрынкі ва двары павінны шчыльна прыкрывацца.

Трымайце ежу прыкрытай ад мух.

Калі ўсё гэта будзе выканана, мухам не будзе дзе распаўсюджвацца.

Знішчайце мух!

Не дапускайце ў жыллі ворагаў здароўя—мух.

Стаўляйце летам у вокнах сеткі з марлі. Прымяняйце для знішчэння мух мухалоўкі з ліпкай і ядавітай паперы, раствор фармаліна.

У журнале „Гигиена и санитария“ (№ 7 за 1936 г.) І. П. Далін прапанаваў наступны астраумны спосаб барацьбы з мухамі. Бяруць невялікую скрынку, выламваюць дно, на месца якога нацягваюць адпаведнай велічыны мяшок, які прыкалваюць да знадворных сценак скрынкі кнопкамі ці прыбіваюць цвікамі. Унутраную паверхню сценак скрынкі змазваюць сумессю з мукі, цукру і вады, павідлам ці проста салодкай вадой. Мухі імкнуцца ўнутр скрынкі; тады скрынка зачыняецца крышкай; мух страсаюць у мяшок.

Для такой простай мухалоўкі можна скарыстаць таксама кансервавыя банкі, картонныя каробкі з-пад гільз, бацінак і т. д. Назбіраных у мяшок мух трэба ашпарыць кіпяткам і выкінуць у мусарную скрынку.

Вядзіце барацьбу з мухамі!

Дапамагайце санітарнаму надзору ў барацьбе з мухамі. Сачыце за тым, каб прадаваемыя харчовыя прадукты ў магазінах, на рынках былі прыкрыты ад мух. Распаўсюджвайце ўсюды звесткі аб шкодзе, якую прыносяць мухі.

Піонеры і школьнікі!

Прыміце ўдзел у барацьбе з мухамі. Паглядзіце, ці ўсё зроблена дома, у школе для папярэджання размнажэння мух. Зніштажайце мух і іх лічынкі ранняй вясной. Не забывайце, што кожная зніштожаная муха магла-б на працягу лета даць велізарную колькасць мух.

Бойцеся і знішчайце мух!

„Гигиена и санитария“

Адказны рэдактар Г. В. КАГАН.

Адрас рэдакцыі: Менск, Дом Працы, 3-ці паверх, пакой 8. Тэл. 24-058, 24-070.

Друкарня імя Сталіна. Зак. № 3802. Тыраж 10.500 экз. Уп. Галоўліта БССР № 910.

Здана ў друкарню 21/VIII—38 г. Падпісана да друку 5/IX—38 г. У нумары 2½ арк. 120.140 друк. знакаў

Цана 20 кап.

082

1964

B000000 198 1 184

12 жніўня ў Менску адбыўся масавы пераход моладзі ў процігазах на 5 кілометраў.
На здымку: Калона ўдзельнікаў перахода.
Фото Л. Мазелева (Саюзфото).